УДК 811.161.3-3:811.111-3

СЕМАНТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ САМАТЫЧНАЙ ФРАЗЕАЛОГІІ Ў БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОВАХ

Т.М. ШАГУН
(Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна)

У артыкуле падаецца семантычная характарыстыка фразеалагізмаў-саматызмаў беларускай і англійскай моў. Згодна з нашым даследаваннем сярод вылучаных тэматычных груп вывучаемага матэрыялу – апісанне чалавека, апісанне дзеяння, апісанне прадмета, з'явы – першая найбольш пашырана ў семантыцы ўзятага для аналізу матэрыялу. Дэталёвы аналіз семантыкі названых адзінак з прадуктыўнымі і высокапрадуктыўнымі саматычнымі кампанентамі паказаў дамінантнасць такіх тэматычных падгруп, як апісанне паводзін і апісанне стану чалавека. Намінатыўнасць, сімвалізм, фігуральнасць, культурная рэлевантнасць вызначаюцца ў артыкуле як спецыфічныя рысы саматычнай фразеалогіі вывучаемых моў. Большасць вывучаемых фразеалагізмаў беларускай і англійскай моў (93 і 95 % адпаведна) належаць да групы намінатыўных адзінак. Адзначаецца, што менавіта намінатыўныя адзінкі ў шырокім сэнсе могуць выступаць у якасці тропаў або фігур. Таму спецыфікай намінатыўных саматычных фразеалагізмаў абедзвюх моў з'яўляецца 1) магчымасць апісальна, фігуральна, называць з'явы рэчаіснасці, максімальна замацоўваючы і перадаючы іх сэнс; 2) пэўная сувязь с працэсамі ўспрымання, а не адлюстравання навакольнага свету.

Пэўнай адметнасцю фразеалагічных зваротаў неабходна лічыць іх магчымасць перадаваць праяўленні духоўнага і матэрыяльнага жыцця праз словы-кампаненты, якія абазначаюць фізічныя, матэрыяльныя працэсы, якасці, станы, што ўспрымаюцца зрокам, слыхам і да т.п. Такімі з'яўляюцца словы-саматызмы, што даволі часта сустракаюцца ў складзе беларускіх і англійскіх фразеалагічных зваротаў: колькасць фразеалагізмаў з саматычным кампанентам у беларускай і англійскай мове складае 22 і 10 % адпаведна.

Большы аб'ём саматычных фразеалагізмаў у беларускай мове тлумачыцца пашыранасцю адносін сінаніміі сярод саматычных лексем у названай мове ў параўнанні з англійскай: амаль кожная саматычная лексема прадстаўлена двума або трыма сінонімамі.

Напрыклад, *галава – бубен; лоб – чало; вантробы – кішкі, трыбухі, нутро; твар – рыльца, міна; горла – глотка, гартань; жылы – гізунты; спіна – карак.*

У англійскай мове сінанімічныя адносіны сярод саматычных лексем назіраюцца адносна рэдка: толькі 8 саматычных лексем англійскай мовы прадстаўлены сінонімамі.

Напрыклад, *head* 'галава' – *top, bonnet, scalp, skull; hump* 'горб' – *hunch; breast* 'грудзі' – *chest, bosom; feather* 'пер'е' – *hackle; muscles* 'мускулы' – *brawns; backbone* 'хрыбет' – *spine.*

Тым не менш комплекснае даследаванне саматычных фразеалагізмаў беларускай і англійскай моў сведчыць аб тым, што іх склад надзвычай багаты: мы выявілі 2028 і 1239 саматычных фразеалагізмаў у беларускай і англійскай мовах адпаведна, у склад якіх уваходзяць 131 і 102 саматычных кампанентаў гэтых моў.

У параўнальных даследаваннях фразеалагічных зваротаў апошніх дзесяцігоддзяў (Е.Ф. Арсенцевай, Г.А. Ахмятжановай, Т.А. Берднікавай, К.Е. Гафаравай, Т. Цзюнь) адзначаецца, што лексіка-семантычная база фразеалагізмаў абумоўлена гістарычным укладам жыцця, этнаграфічнымі асаблівасцямі народа. Аднак, згодна з класіфікацыяй Р.М. Вайнтраўба, які падзяляе фразеалагізмы на натуральныя і канвенцыянальныя, саматычныя фразеалагізмы падпадаюць пад катэгорыю натуральных, тым самым выяўляючы агульнасць лексіка-семантычнай базы розных моў [1, с. 160].

Цікава, што натуральныя саматычныя фразеалагізмы – гэта ўстойлівыя выразы, якія ўзнікаюць у кожнай мове стыхійна, незалежна ад другой мовы, аднак у аснове іх фарміравання знаходзяцца тры фактары:

1) навакольная рэчаіснасць (назіраемыя чалавекам з'явы прыроды, асаблівасці эвалюцыі жывёльнага і расліннага свету);

2) заканамернасці развіцця свету (глабальныя гістарычныя падзеі сусветнага значэння);

3) індывідуальныя прыметы чалавека (яго фізічныя, псіхалагічныя, характаралагічныя асаблівасці).

Менавіта трэці з названых фактараў больш выразна ўплывае на фарміраванне фразеалогіі з прадуктыўнымі і высокапрадуктыўнымі саматычнымі кампанентамі англійскай і беларускай моў, што і зафіксавана ў ніжэйпрыведзеных табліцах 1 і 2.

Табліца 1

Семантычная карта фразеалагізмаў беларускай мовы
з прадуктыўнымі і высокапрадуктыўнымі саматычнымі кампанентамі

№ п/п	Саматычны кампанент	Тэматычныя группы																	
		Апісанне чалавека							Апісанне дзеяння								Апісанне прадмета		Усяго
		паводзіны	пачуцці	стан	характар	знешнасць	розум	здольнасці	фізічнае	перцэптыўнае	спосаб	месца	час	ступень	колькасць	мэта	якасць	адносіны да прадмета	
0	00	1,1	1,2	1,3	1,4	1,5	1,6	1,7	2,1	2,2	2,3	2,4	2,5	2,6	2,7	2,8	3,1	3,2	4
1	вока	56	34	47	4	8	–	–	8	7	25	13	2	15	–	2	8	4	233
2	галава	32	4	71	3	–	23	1	–	37	12	3	1	5	1	–	2	6	201
3	рука	58	4	54	5	1	–	18	2	–	49	12	2	1	–	–	5	4	215
4	нага	13	3	57	–	1	1	2	4	–	33	4	1	1	–	–	6	1	127
5	душа	9	22	50	7	2	–	–	1	–	22	1	–	6	4	–	2	1	127
6	язык	59	–	13	11	–	–	9	2	–	6	–	–	–	–	–	5	4	109
7	сэрца	1	22	41	5	–	–	–	–	–	12	–	–	1	–	–	1	–	83
8	нос	13	7	13	5	–	1	2	5	4	5	6	1	–	5	–	5	1	73
9	вуха	6	1	13	5	–	1	3	6	11	11	1	2	3	1	–	2	1	67
10	зуб	10	6	20	2	–	–	5	2	–	2	3	1	5	2	–	–	–	58
усяго		257	103	379	47	12	26	40	30	59	177	43	10	37	13	2	36	22	1293
%		20	8	29	3,6	0,9	2	3,1	2,3	4,6	13,8	3,3	0,8	2,9	1	0,2	2,8	1,7	100

Табліца 2

Семантычная карта фразеалагізмаў англійскай мовы
з прадуктыўнымі і высокапрадуктыўнымі саматычнымі кампанентамі

№ п/п	Саматычны кампанент	Тэматычныя группы																	
		Апісанне чалавека							Апісанне дзеяння								Апісанне прадмета		Усяго
		паводзіны	пачуцці	стан	характар	знешнасць	розум	здольнасці	фізічнае	перцэптыўнае	спосаб	месца	час	ступень	колькасць	мэта	якасць	адносіны да прадмета	
0	00	1,1	1,2	1,3	1,4	1,5	1,6	1,7	2,1	2,2	2,3	2,4	2,5	2,6	2,7	2,8	3,1	3,2	4
	%	40,4	5	23,6	5,2	3,9	1,6	4,7	0,8	2,5	4,5	0,9	0,2	0,5	0,2	–	5,1	0,9	100
1	head	27	2	25	5	–	6	7	2	6	5	–	–	1	–	–	3	–	89
2	heart	15	8	15	10	–	–	–	–	1	4	–	–	1	–	–	–	1	55
3	face	30	4	7	2	8	2	–	–	–	1	–	–	–	–	–	–	–	54
4	foot	18	2	22	5	2	1	2	1	–	–	–	–	–	–	–	–	–	53
5	ear	20	4	8	1	1	1	4	1	8	–	1	–	–	–	–	1	1	51
6	back	24	1	11	1	–	–	–	–	–	1	2	–	–	–	–	2	1	43
7	blood	15	7	8	–	5	–	–	–	–	2	–	–	–	–	–	3	–	40
8	mouth	21	3	6	2	2	–	–	–	–	–	1	–	–	–	–	4	–	39
9	eye	39	1	23	3	7	–	8	1	1	7	1	1	1	–	–	10	2	105
10	hand	51	–	27	5	–	–	9	–	–	9	1	–	–	1	–	10	1	114
усяго		260	32	152	34	25	10	30	5	16	29	6	1	3	1	–	33	6	643
%		40,4	5	23,6	5,2	3,9	1,6	4,7	0,8	2,5	4,5	0,9	0,2	0,5	0,2	–	5,1	0,9	100

Так, было выяўлена, што сярод вылучаных тэматычных групп ФАСК[1] БМ[2] і АМ[3] – апісанне чалавека, апісанне дзеяння, апісанне прадмета, з'явы – першая прадстаўлена як дамінуючая, найбольш пашыраная ў семантыцы ўзятага для аналізу матэрыялу.

Напрыклад, *дзіравая барада; пераяда вантроб; адзін, як вока ў лобе; адны вочы засталіся; a pain in the backside – 'надакучлівы чалавек'; a bag of bones –'вельмі схуднелы'; a bird brain – 'неразумны чалавек'; dead from the neck – 'дурны'*.

У працэнтных суадносінах дадзеныя групы складаюць 66.6 : 84.4; 28.9 : 9.6; 4.5 : 6 адпаведна для корпусаў беларускай і англійскай моў.

Дэталёвы аналіз семантыкі фразеалагізмаў беларускай і англійскай моў з прадуктыўнымі і высокапрадуктыўнымі саматычнымі кампанентамі дазваляе зрабіць вывад аб дамінантнасці такіх тэматычных падгруп, як апісанне паводзін і стану чалавека.

Да групы са значэннем «апісанне паводзін» у беларускай мове адносіцца 20 %, а ў англійскай – 40,4 % прааналізаваных фразеалагізмаў.

Напрыклад, *асакою скакаць у вочы* – 'назойліва прыставаць, невыносна дакучаць', *выбіваць з галавы дур* – 'строга дзейнічаючы, адвучаць каго-небудзь ад дрэнных звычак, схільнасцей і пад.', *адмахвацца рукамі і нагамі* – 'рашуча, наадрэз адмаўляцца ад чаго-небудзь, усімі сіламі супраціўляцца чаму-небудзь', *ісці нага ў нагу* – 'дзейнічаць аднадушна, узгоднена, не адставаць у якіх-небудзь адносінах', *вісець над душой* – 'дакучаючы, патрабаваць неадкладнага выканання' або *bite (or snap) someone's head off* – 'reply sharply and brusquely to someone – адказаць камусьці рэзка, груба', *find it in one's heart to do something* – 'allow or force oneself to do something – дазваляць або застаўляць сябе нешта зрабіць', *get out of someone's face* – 'stop harassing or annoying someone – пераставаць дакучаць каму-небудзь або раздражняць каго-небудзь', *dig in one's heels* – 'resist stubbornly; refuse to give in – супрацьстаяць, адказвацца саступіць'.

Да групы са значэннем «апісанне стану» ў беларускай мове адносіцца 29 %, а ў англійскай – 23,6 % прааналізаваных фразеалагізмаў.

Напрыклад, *і вочы звесці* – 'ледзь-ледзь задрамаць, крышачку заснуць', *не верыць сваім вачам* – 'вельмі здзіўляцца, убачыўшы што-небудзь нечаканае', *рваць душу* – 'моцна трывожыць, хваляваць, мучыць каго-небудзь', *шалёная муха ўкусіла за вуха* – 'хто-небудзь нечакана раззлаваўшыся, занадта гарачыцца', *кляваць носам* – 'драмаць седзячы ці стоячы', *трымаць нервы ў кулаку* – 'захоўваць самавалоданне, вытрымку, стрымліваць парывы сваіх пачуццяў' або rub one's hands – 'show keen satisfaction or expectation – выказваць вялікую задаволенасць або чаканне', be in safe hands – 'sb[4] is being looked after by sb who can be trusted – нехта знаходзіцца пад наглядам таго, каму магчыма давяраць', there wasn't a dry eye (in the house) – 'everyone in the audience (of a film, play, speech, etc.) was moved to tears – кожны, хто глядзеў фільм, выступленне, быў даведзены да слёз', sleep with one eye open – 'sleep very lightly so as to be aware of what is happening around one – спаць вельмі чуйна', not bat (or without batting) an eyelid (or eye/eyelash) – 'show (or showing) no emotional or other reaction – не выказваючы эмацыянальнай або іншай рэакцыі', one's heart is in their mouth – 'feel extremely nervous – быць вельмі ўзнерваваным', with one's back to (or up against) the wall – 'in a desperate situation – апынуцца ў адчайным становішчы', have steam coming out of one's ears – 'be extremely angry or irritated – быць вельмі злым або раздражнёным'.

На наш погляд, дадзены вынік не з'яўляецца нечаканым. Чалавек перш за ўсё ёсць сацыяльная адзінка. Паспяховасць узаемаадносін залежыць ад магчымасці правільна разумець, інтэрпрэтаваць учынкі, словы іншых прадстаўнікоў соцыума. Правільнасць, беспамылковасць інтэрпрэтавання паводзін, учынкаў, станаў іншых людзей можа быць дасягнута толькі пры існаванні адзінага, добра вядомага эталона, з якім у любы час можна параўнаць і супаставіць.

Для чалавека яго цела не з'яўляецца загадкай, ён разумее яго і праз яго ўспрымае навакольнае асяроддзе і культуру. Як пішуць Д.Б. Гудкоў і М.Л. Каўшова, у цэнтры Сусвету знаходзіцца Чалавек. Менавіта чалавечае цела задае параметры першапачатковага вымярэння прасторы і, суадносна, часу, базавыя архітыповыя апазіцыі «далёка – блізка», «свой – чужы» і інш. Цела ўвогуле і асобныя яго часткі могуць разглядацца як першапачатковая аснова для канцэптуалізацыі свету (як знешняга для чалавека, так і ўнутранага). Разважанне над сваім целам, яго межамі, будовай з'яўляюцца крыніцай для ўспрымання і

[1] ФАСК – фразеалагічная адзінка з саматычным кампанентам.

[2] ФАСК БМ – фразеалагічныя адзінкі з саматычным кампанентам беларускай мовы.

[3] ФАСК АМ – фразеалагічныя адзінкі з саматычным кампанентам англійскай мовы.

[4] sb – somebody 'нехта, хтосьці'.

апісання прасторы (успомнім такія меры даўжыні, як *пядзь, локаць, foot* і інш.), так і ўніверсальных метафар, якія ўжо даўно не ўспрымаюцца як троп *(нос карабля, атакаваць у лоб, the eye of a needle – вушка іголкі)* [2, с. 72]. Часноў Я.В. звязвае гэта з такой уласцівасцю віртуальнага мыслення, як візуальнасць або іканізм. Па яго меркаванні, аб'екты навакольнага асяроддзя звязаны паміж сабой ідэйна-візуальнымі сувязямі. «Так, цела чалавека аказваецца суразмерным ландшафту: горы – спінны хрыбет, рэкі – крывяносныя сасуды і г.д.» [3, с. 32].

Безумоўна, нельга не згадзіцца з Д.Б. Гудковым, што «пазнанне сябе ў навакольным свеце пачынаецца з асабістай ідэнтыфікацыі, з адчування межаў асабістага "Я" ў супрацьпастаўленні да свету» [2, с. 74]. Аднак выкарыстанне саматычнай фразеалогіі ў маўленчай дзейнасці сведчыць аб тым, што ў працэсе свайго развіцця людзі навучыліся абстрагавацца ад свайго цела як галоўнага інструмента пазнання. Фразеалагічны зварот адсылае нас не да канкрэтнага чалавека, а да цела вобразнага, сімвалічнага, якое парознаму можа расшыфроўвацца ў розных культурных кантэкстах. Так, у беларускай культуры *кроў* падаецца як носьбіт жыцця *(да апошняй кроплі крыві, змываць крывёй, кроў пральецца)* і пачуццяў (*кроў ледзянее, кроў адхлынула ад твару, пісаць крывёй сэрца)*, родавых сувязей *(плоць і кроў, блакітная кроў, кроў ад крыві*) і інш. *Вуха (вушы)* сімвалізуе слых *(навостраць вушы, мядзведзь на вуха наступіў)*, паўнату чаго-небудзь *(па самыя вушы)*, звязана з нашым уяўленнем аб увазе і даверы *(адным вухам, краем вуха, навешванне лапшы на вушы)*. *Губы (вусны)* падаюцца як сімвал маўлення (*не сыходзіць з вуснаў, укладвацца ў вусны, павесіць замок на губы*). У англійскай культуры *blood (кроў)* падаецца як сімвал фізічных пераадоленняў *(like getting blood out of (or from) a stone; blood, sweat, and tears)*, пачуццяў *(make one's blood boil, make one's blood run cold)*; *ear (вуха)* – як сімвал слыху *(cock one's ear, be all ears)*, уздзеяння на чалавека *(have someone's ear)*, паўнаты чаго-небудзь *(have something coming out of one's ears)*; *lips (вусны, губы)* падаюцца як сімвал пачуццяў і маўлення *(bite one's lip, pay lip service to something, someone's lips are sealed)*.

Такім чынам, саматычныя фразеалагічныя выразы ўтвараюць своеасаблівы «саматычны» код культуры, які займае не апошняе месца ў стварэнні моўнай карціны свету разам з зааморфным, раслінным, прыродным, артэфактыўна рэчавым, гастранамічным, архітэктурным, рэлігійным, часавым, прасторавым, колькасным, колерным і іншымі кодамі культуры [2, с. 99]. Разам з тым саматычныя фразеалагізмы, абавязковым кампанентам якіх выступаюць найменні частак цела чалавека або жывёлы, адыгрываюць асаблівую ролю ў камунікацыйных працэсах.

Фразеалагізмы, паводле А. Вяжбіцкай, уяўляюць сабой «паняційныя інструменты, якія адлюстроўваюць былы вопыт грамадства адносна дзеянняў і разважанняў аб розных з'явах пэўнымі шляхамі; і яны спрыяюць замацаванню гэтых шляхоў. Паступова, разам са зменаю грамадства, названыя інструменты могуць таксама паступова відазмяняцца і адміраць. <…> Людзям, якія добра валодаюць дзвюма рознымі мовамі і ведаюць дзве розныя культуры, звычайна відавочна, што мова і вобраз мыслення ўзаемазвязаныя» [4, с. 269].

Такім чынам, бясспрэчная падобнасць чалавечага цела ў носьбітаў розных моў можа паслужыць тлумачэннем супадзення вобразнасці саматычных фразеалагізмаў у розных мовах, што прыводзіць да ўзнікнення блізкіх ФАСК, якія ў сваю чаргу дэманструюць універсальны характар пераносу саматычных лексем, іх функцыянальна-семантычную дынаміку ў складзе фразеалагічных выразаў.

Шматлікасць саматычных фразеалагізмаў у розных мовах натуральная, таму што «саматычныя лексемы, якія складаюць іх, валодаюць высокай магчымасцю метафарызацыі» [5, с. 106]. Часткі цела выкарыстоўваюцца ў якасці своеасаблівых эталонаў для параўнання, таму што пастаянна знаходзяцца перад вачыма чалавека. На той факт, што «стварэнне саматычных фразеалагічных выразаў на аснове метафарычнага або метанімічнага пераносу з'яўляецца найбольш прадуктыўным фактарам узнікнення гэтых выразаў», – указваюць таксама і В.С. Данілаў, і Н.В. Куніцкая [6, с. 83].

Аднак для больш дэталёвага тлумачэння супадзення вобразнасці саматычных фразеалагізмаў неабходна не толькі ведаць фактары і шляхі, якія ўплываюць на іх стварэнне, але і разумець сутнасць дадзеных зваротаў.

На наш погляд, спецыфіка і неадназначнасць саматычных фразеалагізмаў заключаецца ў тым, што яны маюць дачыненне хутчэй да *ўспрымання* навакольнай рэчаіснасці і чалавека ў ёй праз прызму чалавечага цела, чым да *адлюстравання* з'яў, падзей, дзеянняў або характарыстык прадметаў ці людзей. Менавіта таму рэфлексія над сваім целам, яго межамі, будовай з'яўляецца крыніцай для ўспрымання і апісання навакольнага асяроддзя (прыпамятаем такія меры даўжыні, як *пядзь, локаць, foot* і інш.).

У складзе фразеалагізмаў найменні частак цела ў залежнасці ад сваёй вядучай функцыі ў арганізме, формы, памеру, месца ў дачыненні да іншых частак цела выкарыстоўваюцца не ў пераносным значэнні, а ў фігуральным сэнсе, як тропы або «фігуральныя выкарыстанні слоў» [7, с. 65].

Відавочна, што такія саматычныя кампаненты, як: *хрыбет (backbone)* – ‘пазваночнік чалавека або жывёлы’; *вока (eye)* – ‘орган зроку, а таксама сам зрок’; *рука (arm)* – ‘верхняя канечнасць чалавека ад пляча да кончыкаў пальцаў, а таксама ад запясця да кончыкаў пальцаў’; *язык* – ‘рухомы мышачны орган у ротавай поласці, які з’яўляецца органам смаку, а ў чалавека ўдзельнічае таксама ва ўтварэнні гукаў мовы’ [8], у складзе фразеалагічнага зварота выкарыстаны не ў прамым значэнні, а фігуральна, суадносна ролі дадзеных частак цела: падтрымліваць, глядзець, удзельнічаць або даставаць, размаўляць.

Напрыклад, *put* ***backbone*** *into someone* – ‘падбадзёрыць кагосьці весці сябе цвёрда, непрыхільна’, *an eagle* ***eye*** – ‘магчымасць разгледзець самыя малыя дэталі’, *the long (or strong)* ***arm*** – ‘магчымасць дастаць/ або ***язык*** *дрэнна падвешаны* – /свабодна, лёгка і прыгожа гаварыць’, *умыць* ***рукі*** **–** ‘ухіліцца ад адказнасці, ад удзелу ў чымсьці’.

Саматычныя кампаненты *спіна (back)* – ‘частка тулава ад шыі да крыжа’; *пуп* – ‘упадзіна на сярэдзіне жывата’; *рука (arm)* – ‘верхняя канечнасць чалавека ад пляча да кончыкаў пальцаў, а таксама ад запясця да кончыкаў пальцаў’; *падмышкі (armpits)* – ‘упадзіна пад рукой каля пляча’ [8], выкарыстаны таксама не ў прамым значэнні, а фігуральна, адпаведна са знаходжаннем дадзеных частак цела: блізка, далёка, глыбока, у цэнтры, ззаду, спераду і г.д.

Напрыклад, *up to one’s* ***armpits*** **–** ‘быць уцягнутым у непрыемную сітуацыю’, *at the* ***back*** *of your mind* – ‘думка, далёкая, на перыферыі’, ***рукой*** *падаць* – ‘зусім блізка, не вельмі далека’, ***пуп*** *зямлі* – ‘самы важны, самы галоўны, цантральны’.

У якасці прыкладаў фігуральнага выкарыстання саматычных кампанентаў суадносна форме можна прывесці наступныя: *have* ***eyes*** *bigger than one’s* ***stomach*** – ‘вочы робяцца большыя за страўнік пры здзіўленні’, *a bag of* ***bones*** **–** ‘быць схуднелым, худым як косці’, ***язык*** *доўгі* – ‘быць занадта балбатлівым’, ***рэбры*** *ды* ***скура*** – ‘быць схуднелым, худым як рэбры’.

Пацвердзіць нашу думку аб фігуральнай сутнасці саматычных фразеалагізмаў дапамагае і той факт, што іх большасць (93 і 95 % фразеалагічных зваротаў у беларускай і англійскай мовах адпаведна) у англійскай і беларускай мовах належыць да групы намінатыўных адзінак. Менавіта намінатыўныя адзінкі ў шырокім сэнсе могуць выступаць у якасці тропаў або фігур. Уваходзячы ў склад камунікатыўных адзінак, яны ўзбагачаюць нашу мову, надаюць ёй жывасць і сакавітасць, фігуральнасць. Таму спецыфікай намінатыўных саматычных фразеалагізмаў абедзвюх моў з’яўляецца іх магчымасць апісальна – не прама – называць прадметы, дзеянні, з’явы рэчаіснасці, максімальна замацоўваючы і перадаючы іх сэнс.

Так, параўнальны аналіз фактаграфічнага матэрыялу з прадуктыўнымі і высокапрадуктыўнымі саматычнымі кампанентамі дазволіў нам вылучыць наступныя групы саматычных фразеалагізмаў, якія фігуральна называюць або апісваюць:

1) чалавека. Працэнтныя суадносіны дадзеных груп у беларускай і англійскай мовах складаюць 66,6 і 84,4 % адпаведна. Напрыклад, *cock sb’s* ***ears***, *play a hunch, give sb a* ***leg*** *up* або *збіцца з* ***ног***, *капаць на* ***мазгі***, *намяць* ***бакі***;

2) дзеянне. Працэнтныя суадносіны дадзеных груп у беларускай і англійскай мовах складаюць 28,9 і 9,6 % адпаведна. Напрыклад, ***cheek*** *by* ***jowl***, *dead from the* ***neck***, *easy on the* ***ear*** або ***рукамі*** *і* ***нагамі***, *на адной* ***назе***, ***мазгі*** *набакір, сямі* ***пядзяў*** *у* ***лбе***, *ва ўсе* ***лапаткі***;

3) прадмет або сітуацыю, з’яву. Працэнтныя суадносіны дадзеных груп у беларускай і англійскай мовах складаюць 4,5 і 6 % адпаведна. Напрыклад, *a pain in sb’s* ***backside***, *first* ***blood***, ***eye*** *candy* або *гарматнае* ***мяса***, *крывавы* ***пот***, *папоўскае* ***вока***.

Заключэнне. Саматычныя фразеалагічныя звароты служаць не столькі для таго, каб абазначаць, характарызаваць прадметы, дзеянні, з’явы ці прыметы навакольнага асяроддзя, колькі для таго, каб апісаць іх, назваць і фігуральна інтэрпрэтаваць. Сутнасць саматычных фразеалагізмаў заключаецца ў тым, што яны праз кампаненты-саматызмы, якія называюць фізічныя, матэрыяльныя працэсы, якасці, станы, зафіксаваныя з дапамогай органаў успрымання, фігуральна перадаюць рознага роду праяўленні духоўнага і матэрыяльнага жыцця.

ЛІТАРАТУРА

1. Вайнтрауб, Р.М. Опыт сопоставления соматической фразеологии в славянских языках / Р.М. Вайнтрауб // Вопросы фразеологии. – 1998. – № 3. – С. 157 – 162.
2. Гудков, Д.Б. Телесный код русской культуры: материалы к словарю / Д.Б. Гудков, М.Л. Ковшова. – М.: Гнозис, 2007. – 288 с.

3. Чеснов, Я.В. Телесность человека: философско-антропологическое понимание / Я.В. Чеснов. – М.: ИФ РАН, 2007. – 213 с.
4. Вежбицкая, А. Семантические универсалии и описание языков / А.С. Вежбицкая. – М.: Школа «Языки русской культуры», 1999. – 778 с.
5. Чайко, Т.Н. Названия частей тела как источник метафоры в апеллятивной и ономастической лексике / Т.Н. Чайко // Вопросы ономастики. – Свердловск, 1974. – № 8 – 9. – С. 98 – 106.
6. Данилов, В.С. Образование соматических фразеологизмов на основе семантических сдвигов составляющих компонентов / В.С. Данилов, Н.В. Куницкая // Современные проблемы романистики: функциональная семантика. – Калинин, 1986. – Т. 1. – С. 83 – 85.
7. Арнольд, И.В. Лексикология современного английского языка: учеб. для ин-тов и фак. иностр. яз. / И.В. Арнольд. – 3-е изд., перераб. и доп. – М.: Высш. шк., 1986. – 295 с.
8. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65000 слоў / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко; афармленне А.М. Хількевіча. – 4-е выд. – Мінск: БелЭН, 2005. – 784 с.

Паступіў 10.12.2010

SEMANTIC PECULIARITIES OF SOMATIC PHRASEOLOGY OF BELARUSIAN AND ENGLISH LANGUAGES

T. SHAGUN

The article reveals semantic characteristics of Belarusian and English somatic phraseological units. Among the thematic groups singled out in the material analyzed such as personal description, activity description, object or phenomenon description, the first one is most widely spread in the semantics of the material taken for the analysis. Detailed semantic analysis of the units with productive and highly productive somatic components shows domination of such thematic subgroups as description of behaviour and description of state of a person. Nominativeness, symbolism, figurativeness and cultural relevance are defined as the specific features of somatic phraseology in the languages compared in the article. The greater part of somatic phraseologisms in Belarusian and English languages (93 % i 95 % respectivly) belongs to the group of the nominative units. It is noted that only nominative units in a broad sense can function as tropes or figures. So the specificity of the nominative somatic phraseologisms in both languages consists in 1) their ability to name objects, actions, phenomena in a descriptive and figurative – way, fixing and rendering their meaning; 2) their definite connectedness with the processes of perception but not of reflection of the surrounding world.